З НОВЫМ НАВУЧАЛЬНЫМ!

ПРАЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

Беларускі УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ЙРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА.

№ 24 (781) ● Аўторак, 1 верасня 1970 г. ● Цана 2 кап. ● Год выдання XXIII

ВЕРАСЕНЬ. ДЗЕНЬ ПЕРШЫ

Сёння мала знойдзецца людзей, не кранутых хваляваннямі. Пачатак навучальнага года — вялікая, радасная падзея і для маленькага першакласніка, і для юнага студэнта, пераадолеушага цяжкасці уступных экзаменаў і завяваушага права заняць месца у вну.

З 1 верасня у першакурснікаў пойдзе адлік ...бычным студэнцкім гадам. Цяпер на працягу ...яці год побач з імі будуць дасведчаныя выкладчыкі, вопытныя метадысты, надзейныя сябры-студэнты. Універсітэт аддае у распараджэнне сваіх выхаванцаў самае сучаснае лабараторнае абсталяванне і матэрыялы, багацейшую бібліятэку, якая налічвае мільён тамоў, шматлікія вучэбныя кабінеты. Да іх паслуг праслауленыя мастацкія калектывы і разнастайныя спартыуныя секцыі. Карыстайцеся гэтымі багаццямі і будзьце дастойнымі звання студэнта універсітэта!

Напярэдадні 1 верасня мы пабывалі на біялагічным факультэце і пацікавіліся, як рыхтуюцца тут да пачатку навучальнага года. Дэкан Павел Рыгоравіч Пятровіч яшчэ прымау наведвальнікаў, цярпліва растлумачваў, чаму не прыняты у лік студэнтаў той ці іншы абітурыент. Прахадны бал вельмі высокі, прэтэндэнтаў нават з выдатнымі і добрымі адзнакамі аказалася больш, чым планавых месц. Сёлета за студэнцкія парты біяфака сядуць 125 першакурснікаў. Першыя лекцыі для іх прачытаюць найбольш вопытныя выкладчыкі. П. Р. Пятровіч павядзе курсы уводзін у біялогію і заалогію беспазваночных, дацэнт С. У. Калішэвіч — анатомію раслін, дацэнт З. Н. Кудрашова— марфалогію раслін. Чытанне лекцый распачнуць новыя выкладчыкі прафесар А. М. Сташкоу (кафедра фізіялогіі чалавека і жывёл), прафесар І. К. Лапацін (кафедра заалогіі пазваночных). Новыя спецкурсы павядзе прафесар Ю. К. Фамічоу і іншыя выкладчыкі факультэта. У верасні чакаецца прыбыццё з Люблянскага універсітэта прафесара А. А. Каняева, які прачытае курс лекцый па мікрабіялогіі.

Летам на біяфаку гасціла група нямецкіх студэнтаў, а днямі на азнаямленча-вытворчую практыку у Гальскі універсітэт выязджае група студэнтау-біёлагаў на чале з дацэнтам У. П. Ляхновічам.

Новы навучальны год пачауся. Наперадзе многа захапляючых падзей, многа работы. Вялікіх вам поспехаў!

А. КУДЛОВІЧ.



Выдатна адказвае на экзамене па рускай літаратуры і мове Л. АСТАПЧЫК.

Фота Д. ЧАХОВІЧА.

Фотарэпартаж аб уступных экзаменах глядзіце на 2-й і 3-й стар.

НА МІЖНАРОДНЫМ ФОРУМЕ

Удзельнікі міжнароднага форуму эканамістаў-аграрнікаў увесь дзень 29 жніуня прысвяцілі знаёмству з калгасамі і саўгасамі, сельскагаспадарчымі навуковымі і навучальнымі ўстановамі Беларусі.

Удзельнікі канферэнцыі азнаёміліся таксама з дзейнасцю Беларускага навукова-даследчага інстытута эканомікі і арганізацыі сельскагаспадарчай вытворчасці, Навукова-даследчага інстытута земляробства, Мінскага трактарнага завода і іншымі прадпрыемствамі і гаспадаркамі, установамі.

«Тут, у сталіцы Беларусі, мною перажыта шмат шчаслівых мінут, атрымана добрая інтэлектуальная зарадка. Я у захапленні ад энергіі мінчан, якія нанава пабудавалі горад, і з падзякай вязу з сабой цёплыя успаміны,—заявіў прадстаунікам друку прафесар Дж. Ваардэнбург (Нідэрланды).

— Арганізатары гэтага форуму, — адзначыў ён, — стварылі сапрауды творчую, рабочую абстаноуку, якая садзейнічае устанауленню кантактаў і абмену думкамі паміж прадстаунікамі розных навуковых школ і напрамкаў. Няма нічога больш цяжкага, чым шукаць ісціну, але рабіць гэта супольна у шчырай абстаноуцы значна лягчэй».

У нядзелю, 30 жніуня, канферэнцыя працягвала работу.

(БЕЛТА).

НАШ ВАЖНЕЙШЫ ДОЎГ

Чарговы навучальны год мы пачынаем з вялікім папауненнем. Звыш трох тысяч юнакоу і дзяучат упершыню пераступілі парог універсітэта. Палова з іх будзе вучыцца на дзённым аддзяленні.

Прыём новага папаунення прайшоу арганізавана. Можна спадзявацца, што ва універсітэт прыняты найбольш падрыхтаваныя і дастойныя. Гэтаму садзейнічала добрая работа прыёмнай і экзаменацыйнай камісій, уся арганізацыя прыёму. Актыуны удзел у адборы кандыдатау у студэнты прынялі вядучыя прафесары і выкладчыкі, партыйныя, камсамольскія і прафсаюзныя арганізацыі. Значная частка першакурснікаў — гэта рабочыя, сяляне і іх дзеці. Упершыню у лік студэнтаў прыняты закончыушыя падрыхтоучае аддзяленне.

Удасканальваючы працэс падрыхтоукі высокакваліфікаваных спецыялістаў, калектыву універсітэта у новым навучальным годзе неабходна яшчэ вышэй узняць навуковы узровень выкладання, палепшыць методыку чытання лекцый і правядзення усіх відаў заняткаў.

Вельмі важна умела спалучаць абавязковае выкананне вучэбных праграм з творчай метадычнай работай. Гэта значыць, што у выкладанні неабходна улічваць узровень развіцця сучаснай навукі і тэхнікі, патрабаванні той галіны гаспадаркі, для якой рыхтуюцца спецыялісты. Непарыўная сувязь навучальнага працэсу з патрабаваннямі вытворчасці яшчэ больш узбагаціць змест і метады вучобы.

Характэрнай асаблівасцю універсітэта з'яуляецца спалучэнне тэарэтычнага навучання студэнтаў з іх практычнай падрыхтоукай. Вытворчая практыка у новым навучальным годзе будзе праводзіцца на аснове новага палажэння, якое прадугледжвае цэлы рад важных момантаў, у тым ліку і прывіццё студэнтам навыкаў у арганізацыі масава-палітычнай і выхаваучай работы у вытворчых калектывах. Да гэтай работы прыцягваюцца кафедры грамадскіх навук.

Удасканаленне навучальнага працэсу — справа усіх выкладчыкаў універсітэта. Яны абавязаны вышукваць новыя сродкі і прыёмы, якія стымулююць імкненні студэнтаў да ведаў, іх самастойную работу.

Перад нашым калектывам стаіць першачарговая задача — акружыць першакурснікаў клопатамі і увагай, дапамагчы ім пераадолець разрыу у метадах навучання у вышэйшай і сярэдняй школе. Для гэтага павінна быць створана старанна прадуманая сістэма кантролю за работай першакурснікаў, якая выключае стыхійнасць і неарганізаванасць у іх самастойных занятках.

Неабходна павышаць і адказнасць саміх студэнтаў за вучобу. Вялікі размах павінна атрымаць навукова-даследчая работа, да якой трэба як мага шырэй прыцягваць студэнтаў.

У навучальным годзе будзе і далей павышацца кваліфікацыя выкладчыкаў. Намечаныя планы накіравання выкладчыкаў на факультэты павышэння кваліфікацыі, а таксама на стажыроуку будуць няухільна выконвацца.

Ва універсітэце накоплен пэуны вопыт арганізацыі в хаваучай работы на навук вай аснове: у яе плана ванні улічваюцца запатр баванні студэнтаў, самі пл ны различаны на увесь пе рыяд навучання. У новь навучальным годзе гэта р бота будзе прадоужана.

Важным залогам посп хаў у камуністычным вых ванні студэнтаў з'яуляецц арганізацыя іх быту. Пар дак і чысціня у інтэрната медыцынскае абслугоуванн і грамадскае харчаванне, з беспячэнне усім неабходны для нармальнай працы і а пачынку, арганізацыя кул турна-масавых мерапрыем ствау — усё гэта павінна стаць прадметам пастая ных клопатаў дэканатаў рэктарата.

Наш доуг — дабіцца н вых поспехаў на усіх уча стках вучэбна-выхаваўча навуковай і вытворчай р работы універсітэта.

В. ДАЛГАРУКАЎ,
начальнік вучэбнага аддзела БДУ.

Гасцінна сустрэлі на Мінскім вакзале в'етнамскіх юнакоу і дзяучат—новае папауненне студэнтаў БДУ.

Фота М. НЕЧЫПАРЭНКІ.

У сераду, 2 верасня, адбудзецца пасяджэнне парткома БДУ. Для абмеркавання прапануюцца наступныя пытанні: арганізацыя палітычнай інфармацыі ва універсітэце і сістэма палітычнай асветы у 1970-71 навучальным годзе.

***

Партыйнае бюро факультэта журналістыкі заслухала даклад сакратара партбюро М. Е. Дастанкі аб плане вучэбна-выхаваўчай работы на першы семестр новага навучальнага года.

Аб падрыхтоуцы калектыву факультэта да удзелу у сельскагаспадарчых работах паведаміу намеснік дэкана камуніст А. І. Раковіч.

***

Камуністы адміністрацыйна-гаспадарчай часткі на сваім сходзе заслухалі справаздачу аб ходзе выканання рашэнняў XVI з'езда ВЛКСМ камсамольскай арганізацыяй. Выступіушыя на сходзе тт. Ваньшына, Ляпіла, Кастроу і іншыя адзначылі недастатковую ініцыятыунасць камсамольцаў. Былі указаны таксама і іншыя недахопы у рабоце камсамольскай арганізацыі.

ПА-ЛЕНІНСКУ ВУЧЫЦЦА КАМУНІЗМУ

Наступіўшы навучальны год багаты новымі планамі, задачамі і імкненнямі камсамольскай арганізацыі універсітэта. Нашы рады істотна папоўніліся за лік першакурснікаў. Колькасць членаў арганізацыі няспынна набліжаецца да 10 тысяч. У гэтыя дні, юбілейныя для нашага беларускага камсамола, нарадзілася яшчэ адна арганізацыя — факультэта прыкладной матэматыкі.

Як і на працягу ўсёй сваёй 49-гадовай гісторыі, намаганні камсамолії універсітэта накіраваны на ўсебаковую дапамогу партыйнай арганізацыі, прафесарска-выкладчыцкаму калектыву ў падрыхтоўцы спецыялістаў, здольных паспяхова рашаць задачы камуністычнага будаўніцтва, навукова-тэхнічнага прагрэсу. Гэта патрабуе перш за усё настойлівай барацьбы за павышэнне ўзроўню ведаў студэнтаў, фарміраванне камуністычнага светапогляду, класавай самасвядомасці, ідэйна-палітычнай загартоўкі. Таму студэнт універсітэта, пачынаючы з першага курса, павінен авалодваць трывалымі ведамі па усіх дысцыплінах, вывучаемых на факультэце, неабходнымі навыкамі і уменнямі, развіваць свае творчыя здольнасці. Выходзячы з гэтага, настойлівая вучоба—высокі доўг кожнага студэнта перад Радзімай, перад народам.

XVI з'езд ВЛКСМ абавязаў камсамольскія арганізацыі вну фарміраваць у кожнага студэнта адказныя адносіны да вучобы, выхоўваць імкненне да авалодання вяршынямі навукі, уменне працаваць сістэматычна, рацыянальна выкарыстоўваць час. Трэба пастаянна памятаць аб арганічным адзінстве працэсаў навучання і выхавання, аб непарыўнай сувязі работы камсамольскіх арганізацый з дзейнасцю прафесарска-выкладчыцкіх калектываў.

Неабходна павысіць асабістую адказнасць перад камсамолам кожнага студэнта за вынікі вучобы. Усякія праяўленні нядобрасумленных адносін да заняткаў, парушэнні дысцыпліны павінны сустракаць у студэнцкім асяроддзі, у камсамольскай арганізацыі прынцыповае асуджэнне. Камітэт камсамола дабіваецца такога становішча, каб работа кожнага студэнта на працягу ўсяго навучальнага года знаходзілася пад кантролем камсамольскай арганізацыі вучэбнай групы, працякала ва ўмовах таварыскай патрабавальнасці і ўзаемадапамогі. Камсамольскія актывісты імкнуцца да таго, каб быць прыкладам у вучобе, яны клапоцяцца аб стварэнні ў групах абставін высокай патрабавальнасці, глыбокай грамадзянскай зацікаўленасці ў тым, каб кожны студэнт стаў сапраўдным спецыялістам.

1969-70 навучальны год прайшоў пад знакам дастойнай сустрэчы 100-годдзя з дня нараджэння У. І. Леніна, чыё імя носіць наш універсітэт. Вялікім аглядам вучэбных і працоўных спраў, марксісцка-ленінскай вучобы, грамадска-палітычнай актыўнасці камсамольцаў універсітэта стаў Усесаюзны Ленінскі залік. Ён мабілізаваў студэнтаў на дастойную сустрэчу юбілею Ільіча, раскрыў лепшыя якасці нашай моладзі, яе гарачае жаданне звяраць свае справы і ўчынкі па запаветах правадыра. На камсамольскіх сходах у групах, патоках, на курсах, факультэтах адбылася вялікая размова аб павышэнні актыўнасці і баявітасці камсамольскіх арганізацый, аб ролі і месцы камсамола, аб фарміраванні светапогляду студэнтаў, аб адносінах да антыграмадскага і мяшчанскага настрою.

Гэта размова плённа адбілася і на паспяховасці студэнтаў, асабліва па грамадскіх дысцыплінах, і на іх удзеле ў рабоце студэнцкага навуковага таварыства, і на павышэнні ўзроўню агітацыйна-прапагандысцкай і культурна-масавай работы. Паспяхова закончыуся працоўны семестр нашых студэнтаў, многа увагі ўдзяляецца выкананню Усесаюзнай камсамольскай двухгодкі «Камсамол — сельскай школе», мацнеюць нашы сувязі з прамысловымі прадпрыемствамі. Імкненне студэнтаў быць бліжэй да рабочага класа, сялянства—гэта важны вынік гадавой работы па Ленінскаму заліку.

У жніўні 1970 года ЦК ВЛКСМ прыняў пастанову аб задачах камсамольскіх арганізацый па дастойнай сустрэчы XXIV з'езда КПСС. Вырашана правесці ва усіх камсамольскіх арганізацыях краіны са жніўня 1970 года па красавік 1971 года Усесаюзны Ленінскі залік, прысвечаны XXIV з'езду КПСС «Мы справе Леніна і партыі адданы».

Галоўная мэта заліку — яшчэ вышэй узняць палітычную, працоўную і грамадскую актыўнасць кожнага камсамольца, усёй моладзі, баявітасць камсамольскіх арганізацый. У ходзе заліку неабходна дабіцца далейшага паляпшэння работы камсамольскіх арганізацыі па палітычнаму выхаванню моладзі, разгарнуць паўсядзённую арганізатарскую работу па выкананню рашэнняў XVI з'езда ВЛКСМ.

Для кожнай камсамольскай арганізацыі, кожнага камсамольца Усесаюзны Ленінскі залік будзе выяўленнем глыбокай адданасці савецкай моладзі Камуністычнай партыі, стане справаздачай аб асабістым укладзе кожнага камсамольца ў выкананне ленінскага запавету «вучыцца камунізму».

Першы этап Усесаюзнага Ленінскага заліку закончыцца 2 кастрычніка 1970 года, у дзень 50-годдзя прамовы У. І. Леніна на III з'ездзе камсамола. Для нас гэты этап супадае з пачаткам навучальнага года, з падвядзеннем вынікаў летняга працоўнага семестра, з удзелам у асенніх сельскагаспадарчых работах. Кожны студэнт у час Усесаюзнага Ленінскага ўрока «Па-ленінску вучыцца камунізму» павінен даць справаздачу аб сваім працоўным укладзе ў народную гаспадарку за гэты перыяд, аб удзеле у грамадска-палітычным жыцці. Разглядаючы гэты перыяд як асабліва важны і з мэтай найлепшай арганізацыі вытворчай і палітыка-выхаваўчай работы кожнай камсамольскай групы, кожнага камсамольца, бюро камітэта камсамола БДУ аб'явіла спаборніцтва ў гонар 50-годдзя ЛКСМБ на лепшую камсамольскую групу ў час сельскагаспадарчых работ.

Ленінскі залік завершыцца Усесаюзным камсамольскім сходам, на якім будуць абмеркаваны вынікі XXIV з'езда КПСС і задачы камсамола па выкананню яго рашэнняў. Сход разгледзіць вынікі выканання студэнтамі-камсамольцамі асабістых абавязацельстваў у гонар XXIV з'езда КПСС. Усесаюзнаму камсамольскаму сходу павінна папярэднічаць грамадска-палітычная атэстацыя кожнага камсамольца. Рашэнне аб здачы камсамольцамі Ленінскага заліку прымаецца камсамольскім сходам і заносіцца ва ўліковую картачку члена ВЛКСМ. Камсамольцы, якія вызначыліся у ходзе заліку, дабіліся высокіх паказчыкаў у вучобе, працы і грамадскай дзейнасці, узнагароджваюцца значком ЦК ВЛКСМ «Ленінскі залік», памятным выданнем кнігі «Біяграфія У. І. Леніна».

Правядзенне Усесаюзнага Ленінскага заліку ставіць перад універсітэцкай камсамоліяй вялікія задачы высокага грамадзянскага гучання. Новы навучальны год для універсітэта перадюбілейны: у 1971 годзе нашаму калектыву, у тым ліку і камсамольскаму, споўніцца 50 год. Паўвекавая дзейнасць нашай ВНУ дазваляе выказаць цвёрдую ўпэўненасць у тым, што камсамол універсітэта быў, есць і будзе надзейным рэзервам і верным памочнікам партыі ў будаўніцтве камунізма.

В. ПРАКОШЫН,
сакратар камітэта камсамола універсітэта.

Выходзь на спаборніцтва!

СЕЛЬСКАЙ ГАСПАДАРЦЫ — КАМСАМОЛЬСКУЮ РАБОТУ

24 верасня 1970 года юнакі і дзяўчаты нашай рэспублікі, увесь беларускі народ урачыста адзначаць 50-годдзе Ленінскага Камуністычнага Саюза Моладзі Беларусі. Уся паўвекавая гісторыя ЛКСМБ — гэта доказ адданасці Камуністычнай партыі. Наша моладзь заўсёды свята захоўвала і памнажала слаўныя рэвалюцыйныя, баявыя і працоўныя традыцыі савецкага народа.

Кожны дзень, практычна рашаючы задачы камуністычнага будаўніцтва, моладзь вялікімі справамі і поспехамі сустракае юбілей.

Наш час, наша работа, наш сённяшні дзень не даюць стаяць на месцы, спыняцца на дасягнутым. Сёння асабліва важна быць строгім і патрабавальным да сябе. Кожны павінен прынцыпова прааналізаваць і асэнсаваць свае адносіны да жыцця, работы, вучобы так, як вучыць нас Камуністычная партыя, як патрабуюць рашэнні XVI з'езда ВЛКСМ.

Ужо стала традыцыяй, што, працягваючы свой працоўны семестр, студэнты універсітэта у верасні працуюць на палях калгасаў і саўгасаў, дапамагаюць працаўнікам сяла. Сёлета гэты перыяд супаў з першым этапам Усесаюзнага Ленінскага заліку, прысвечанага XXIV з'езду КПСС. Разглядаючы удзел у сельскагаспадарчых работах. як асабліва важную справу і з мэтай найлепшай арганізацыі палітыка-выхаваўчай і вытворчай работы кожнай камсамольскай групы у гэты перыяд, бюро камітэта камсамола і прафком універсітэта вырашылі аб'явіць у гонар 50-годдзя ЛКСМБ спаборніцтва на лепшую камсамольскую групу па выніках сельскагаспадарчых работ.

Умовы спаборніцтва

I. Палітыка - выхаваўчая работа

У перыяд сельскагаспадарчых работ студэнты наладжваюць непасрэдную сувязь з калектывамі рабочых і калгаснікаў. Гэтае супрацоўніцтва — не толькі сумесная работа на палях, але і арганізацыя вечароў адпачынку, канцэрты мастацкай самадзейнасці, лекцыі і г. д. Усе гэтыя мерапрыемствы павінны праводзіцца на аснове плана, распрацаванага камсамольскай групай і мясцовай камсамольскай арганізацыяй. Асаблівая увага у гэтым плане павінна быць удзелена тым мерапрыемствам, якія накіраваны на аказанне дапамогі мясцовай школе: абсталяванне ленінскіх пакояў, прадметных кабінетаў, выпуск насценных газет, арганізацыя мастацкай самадзейнасці. Студэнты абавязаны прачытаць лекцыі аб 50-годдзі ЛКСМБ, аб гісторыі універсітэта, свайго факультэта, падзяліцца вопытам камсамольскай работы, арганізаваць вучобу камсамольскага актыву школы. Група праводзіць не менш аднаго нядзельніка, сродкі ад якога павінны быць здадзены ў камітэт камсамола на будаўніцтва ломніка студэнтам і выкладчыкам БДУ, загінуўшым у гады Вялікай Айчыннай вайны.

II. Вытворчая дзейнасць

Штодзённае выкананне вытворчай нормы павінна стаць правілам кожнага студэнта-камсамольца. На якім бы участку камсамолец ні працаваў, ён павінен быць прыкладам у працы для сваіх таварышаў, рабочых і калгаснікаў. Калі па чыёй вінэ работа арганізавана дрэнна, ёсць прастоі, студэнты абавязаны ставіць пытанне перад адміністрацыйным і партыйным кіраўніцтвам калгаса, саўгаса, прадпрыемства аб выпраўленні недахопаў.

III. Дысцыпліна

Сваімі адносінамі да працы, паводзінамі студэнты павінны паказваць прыклад акружаючым. Любое парушэнне працоўнай і бытавой дысцыпліны павінна самым строгім чынам абмяркоўвацца ў групе. Быць дастойным прадстаўніком савецкай інтэлігенцыі, высока несці ганаровае званне савецкага студэнта — ад таго, як будуць выконвацца гэтыя патрабаванні, залежаць вынікі усёй работы камсамольскай групы, яе месца ў спаборніцтве.

IV. Справаздачнасць

Па заканчэнні работ камсоргі груп прадстаўляюць у камітэты камсамола факультэтаў даведкі, завераныя кіраўніком калгаса, саўгаса, прадпрыемства, сакратаром партыйнай і камсамольскай арганізацый. У даведцы, побач з агульнай характарыстыкай работы групы, павінна быць указана:

Выканана работ на суму... (у рублях), на аднаго чалавека... (у рублях).

Прачытана лекцый...

Падрыхтавана канцэртаў...

Праведзена суботнікаў, нядзельнікаў...

Дапамога сельскай школе (што зроблена).

Дысцыпліна групы.

Справаздачныя матэрыялы камсоргі груп здаюць у камітэты камсамола факультэтаў, дзе і падводзяцца папярэднія вынікі спаборніцтва. Пасля выяўлення лепшай групы факультэта матэрыялы аб ёй прадстаўляюцца ў камітэт камсамола універсітэта. Пераможцы спаборніцтва ўзнагароджваюцца.

РЭПАРЦЁР НА

ЗА ПРАВА СТАЦЬ ЖУРНАЛІСТАМ

Вопыт, роздум, прапановы

Праблема конкурснага адбору на журфак нашага універсітэта — тэма многіх партыйных, агульнафакультэцкіх, камсамольскіх, прафсаюзных сходаў. Востра гэтыя пытанні былі пастаўлены і на апошнім пасяджэнні вучонага савета факультэта. У сувязі з тым, што меркавалася запрасіць на яго рэдактараў раённых, абласных, рэспубліканскіх газет, радыё і тэлебачання, віднейшых журналістаў рэспублікі, пісьменнікаў, падрыхтоўка да яго вялася амаль паўгода. Планавалася разам з непасрэднымі работнікамі друку выпрацаваць той крытэрый, які б лёг у аснову ключавых мерапрыемстваў на факультэце, у тым ліку і у наборы будучых студэнтаў на журфак.

На вучоным савеце адбылася жывая размова. Рэдактары вядучых нашых газет «Звязда» і «Советская Белоруссия» прапанавалі прымаць на факультэт журналістыкі толькі «пішучых» абітурыентаў, тых, хто ужо паспрабаваў цвёрдасць і крохкасць свайго пяра, задумаўся над тым, ці варты ён быць у шарэнзе нашых журналістаў. Прапанова была падтрымана большасцю прысутных. Вырашылі прымаць на факультэт толькі «пішучых», тых, хто атрымаў рэкамендацыі газет, радыё і тэлебачання.

У чым станоўчае гэтай прапановы? Што раскрыла яна сёлета пры адборы новых студэнтаў-журналістаў?

Новае пры залічэнні на факультэт, яго станоўчае адчулася адразу ж. Пропускам, які давау права удзельнічаць у конкурсных экзаменах на факультэт, былі выразкі з газет, рэкамендацыі рэдакцый. Ад «няпішучых» заявы не прымаліся. У выніку конкурс на факультэт значна паменшыўся. Тры чалавекі на месца замест шасці, сямі. Але галоўнае не у гэтым. Конкурс паміж «пішучымі» і «няпішучымі» адпау аутаматычна у час прыёму заяў, а не здачы уступных экзаменау, як бывала раней. «Пішучаму» заставалася толькі набраць прахадны бал.

На тым жа вучоным савеце і выкладчыкі і практычныя работнікі друку выказаліся за тое, каб на факультэце была створана свая, асобная камісія для экзаменоукі паступаючых. Не сакрэт, што у праграмах па сучаснай рускай мове (а у нашым універсітэце і па сучаснай беларускай) ёсць матэрыял, які не мае істотнага значэння для журналісцкай адукацыі. Напрыклад, калі для студэнта-філолага аднолькава важны пытанні фаналогіі, арфаэпіі, то для студэнта-журналіста першы з названых раздзелау мае другараднае значэнне. Затое узмацняецца роля навыкау па нарматыунай фанетыцы і арфаэпіі. Або яшчэ. Студэнту-філолагу неабходна добра разбірацца у класіфікацыі даданых сказау. Гэта узбагачае яго тэарэтычныя веды па прадмету, які ён у будучым будзе выкладаць. А для студэнта-журналіста больш важна разумець стылёвую розніцу паміж разнавіднасцямі складаных сказау, стылёвую функцыю канструктыуных элементау сінтаксісу. Такім чынам, напрошваецца вывад: экзаменатару патрэбна выявіць, як абітурыент-журналіст валодае словам, як будуе сказ і г. д. У гэтым больш за ўсё зацікаулен выкладчык-журналіст, а не экзаменатар іншага факультэта. Таму упершыню у гэтым годзе і была створана свая камісія, якая цалкам складалася з выкладчыкаў журфака.

Нам не раз даводзілася прымаць уступныя экзамены. Цяпер мы пераканаліся, як неабходна і важна, каб у журналістаў прымаліся экзамены толькі калектывам гэтага факультэта. Вопытнымі выкладчыкамі кандыдатамі навук Б. В. Стральцовым, Л. Ф. Шылавай, А. В. Балашам і аутарамі артыкула у час экзаменау была зроблена немалая работа. Старанна вывучаліся асабістыя справы паступаючых, іх здольнасці, схільнасці, запатрабаванні, каб пасля падысці да кожнага з іх індывідуальна.

У выніку на экзаменах паміж экзаменатарам і абітурыентам адбывалася шчырая размова. Спачатку нам здавалася, што калі у гэтым годзе паступіла 210 заяу, а у мінулым каля 400, то прахадны бал будзе невысокі. Але мы памыляліся. У першы ж дзень, калі пісаліся і правяраліся сачыненні, абітурыенты паказали сябе на самым высокім узроўні. Калі у мінулыя гады, напрыклад, у групе з 30 чалавек адзнакі «4» і «5» прыпадалі на 7—9 абітурыентау, то у гэтым на 20—25. І важна тое, што не адчувалася істотнай розніцы у веданні канкрэтнага матэрыялу паміж паступаючымі з вёскі і горада. Большасць паступаючых, адрываючыся ад завучаных кніжных палажэнняу і цытат, лагічна і доказна рабіла вывады і абагульненні, крытычна падыходзіла да аналізу таго ці іншага літаратурнага вобраза, героя, персанажа. Мы на справе пераканаліся, як сур'ёзна ставіцца моладзь да жыццёвых праблем. Усё гэта вельмі прыемна. Але нам усё ж хочацца спыніцца і на некаторых хібах у сачыненнях, якія дапускаюцца з году у год. Спроба па-свойму выказаць думку, смеласць у валоданні словам — рэч, вядома, складаная, яна прыходзіць з гадамі, са сталасцю, вопытам, выпрацоукай уласнага стылю, почырку. Абітурыентау, жадаючых правільна лінгвістычна аформіць думку, падсцерагала небяспека. Каб, напрыклад, сказаць проста, лёгка, некаторыя паступаючыя пачынаюць «жаваць жвачку», раструшваць думку ужываннем лішніх слоу і словазлучэнняу. І вось вынік — сказ атрымауся амаль на паустаронкі. Яго даводзіцца чытаць два-тры разы, каб нарэшце разабрацца, што хацеу сказаць аутар.

Мы спецыяльна выпісвалі з сачыненняу сказы, у якіх былі дапушчаны розныя памылкі, каб на вусным экзамене па мове і літаратуры разабрацца, чаму спатыкнуўся тут паступаючы, што не давучыу. На вусных экзаменах разам з гэтым выяўляліся і веды па літаратуры. І калі абітурыенты увогуле нядрэнна арыентуюцца у пастановах Камуністычнай партыі у галіне літаратуры, глыбока ведаюць ідэйна-тэматычны змест праграмных твораў, то побач з гэтым станавіліся бездапаможным, калі сутыкаліся з літаратурным сінтаксісам, пытаннямі, звязанымі з мастацкімі сродкамі літаратуры. Абітурыенты розным чынам ухіляліся ад гэтых пытанняу. Што такое раман, нарыс, эпітэт, гумар, харэй — адказау на такія пытанні, як правіла, не было.

Нешта падобнае можна сказаць і аб сучаснай савецкай літаратуры. Прозвішчы маладых рускіх, беларускіх пісьменнікаў называліся абітурыентамі у абмежаванай колькасці. Яшчэ цяжэй назваць абітурыенту двух-трох буйнейшых савецкіх журналістау. І гэта у той час, калі паступаючы здае экзамен на права быць студэнтам журфака!

І вось яшчэ, нам здаецца, карысная прапанова. У экзаменацыйных білетах па рускай і беларускай літаратуры ёсць такія пытанні: «Твой любімы празаік», «Твой любімы герой» і г. д. Калі абітурыенту трапляе такое пытанне, нельга не зауважыць на яго твары прыемнага задавальнення. Выбірай сабе аутара, героя з любога рамана. І здараецца, што за адзін дзень на экзамене даводзіцца не раз пачуць пра Пушкіна, Шолахава, Коласа, Шамякіна. У абітурыентау гэта самыя любімыя аутары. А ці нельга было б вышэй пералічаныя пытанні білетау удакладніць. Напісаць, скажам: «Твой любімы малады празаік», «Твой любімы паэт рускай класічнай літаратуры» і г. д. Такая б канкрэтызацыя патрабавала павелічэння дыяпазону ведау абітурыента.

Р. БУЛАЦКІ,
старшыня прадметнай камісіі, дэкан факультэта, дацэнт.

І. САЧАНКА,
член прыёмнай камісіі.

КОЖНАМУ БЫЦЬ КАЛУМБАМ

Пачаць свой, можа, у нечым спрэчны артыкул мне хочацца з пісьма адной школьніцы, у якім асаблівую увагу прыцягваюць наступныя радкі: «Як я зайздрошчу вам, студэнтам! Вы — вясёлы і вольны народ, вас не прымушаюць вучыць урокі, не надакучваюць вам і бацькі!»

Вось ён, краевугольны камень самага небяспечнага пачуцця нядаўняга дзесяцікласніка — пачуцця «лёгкага» студэнцкага жыцця. І былому школьніку, які прыйшоу у вну, яшчэ доуга (ох, як доуга!) даводзіцца пераконваць сябе у памылковасці свайго уяулення аб самастойнасці. Прауда, актыўнае пачуццё самаразвіцця разбівае нарэшце лёгкадумнасць. Але часцей за усё гэта здараецца пасля першага-другога курсау, якія, як вядома, патрабуюць асабліва напружанай працы.

Нядаўні школьнік, паступіушы у вну, з многім сутыкаецца упершыню, і калі побач няма чулых, разумных сяброу, недахоп жыццёвага вопыту вельмі хутка дае аб сабе знаць.

Дома маці ганарыцца сынам, мауляу, у людзі выходзіць. А былы дзесяцікласнік, уразаваушыся вызваленню ад оацькоускай апекі, цешыцца «свабодай». Навошта лекцыі? Экзамены не скора. А калі і скора, то знаходзіцца суцяшэнне: як-небудзь, не я першы, не я апошні.

Можна прывесці не адзін прыклад, калі былы школьнік, аддаўшыся бестурботнаму жыццю, трапляў у калектыу не вельмі сумленных людзей. І бывай тады, светлая мара юнацтва! Выпіукі пасля лекцыи, вечарам у кафэ, у інтэрнаце, хаваючыся ад студсавета, па прычыне і без прычыны, проста так. Адсюль і частыя парушэнні норм чалавечых паводзін. Ао вучобе дзе ўжо там і думаць!

Пасля людзі сталеюць. Прыходзяць да цвярозага вываду аб «салодкім жыцці». Ужо не смяюцца, паутараючы «мудрасць» студэнцкую: цяжка жыць нічога не робячы, але мы не баімся цяжкасцей. Паяуляецца жаданне па-сапраўднаму працаваць. Але, на жаль, рэдка удаецца поунасцю папоуніць прабел у ведах. Адыгрывае тут ролю, напэуна, і няуменне правільна скласці свой распарадак дня. Гэта, відаць, якраз тая лінія паводзін, якая ў многім вызначае поспех будучага спецыяліста.

Хто вінаваты ў тым, што ў некаторых студэнтаў-першакурснікаў такі «свабодны» распарадак дня? Вядома, у першую чаргу яны самі. Але ці не вінаваты ў гэтым і мы, выкладчыкі? Ці не вінаваты ў гэтым і мы, выкладчыкі? Ці не вінаваты ў гэтым і мы, выкладчыкі?

ЛЕТА СТУДЭНЦКАЕ

Многія студэнты нашага універсітэта сёлетнія канікулы правялі у маляўнічым кутку Беларусі — на возеры Нарач. Адпачынак у спартыўна-аздараўленчым лагеры пакінуў незабыўныя ўражанні. Надоўга застануцца ў памяці цікавыя падарожжы, вясёлыя спаборніцтвы, вечары дружбы.

НА ЗДЫМКАХ:

● *госці лагера — студэнты будаўнічага атрада «Нарачанка» выступаюць з канцэртам;*

● *узнагароджанне пераможцаў водна-спартыўных спаборніцтваў;*

● *напружаны момант у гульні жаночых футбольных каманд інстытута замежных моў і БДУ.*

Фота М. НЕЧЫПАРЭНКІ.

У ДАРОГУ ПАКЛІКАЛА ДРУЖБА

Першы аўтапоезд «Дружба» з савецкімі і замежнымі студэнтамі навучальных устаноў рэспублікі адправіўся ў падарожжа ў 1965 годзе. Затым кожны год па новаму маршруту сем аўтобусаў везлі дапытлівых пасажыраў у цікавыя экскурсіі. Турысты пабывалі у гарадах і сёлах Беларусі, Расіі, Украіны, Літвы. У мінулым годзе яны наведалі горад-герой на Няве Ленінград.

Сёлета Агульнасаюзны Савет па справах замежных студэнтаў у гонар 100-годдзя з дня нараджэння У. І. Леніна і ў сувязі з 25-годдзем Перамогі савецкага народа над гітлераўскай Германіяй арганізаваў сумесна з Міністэрствам вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі БССР і ЦК ЛКСМ Беларусі ўсесаюзны інтэрнацыянальны аўтапоезд для актыву замежных і савецкіх студэнтаў, якія вучацца ў розных ВНУ Савецкага Саюза. Узначаліў яго супрацоўнік нашага універсітэта Ц. В. Стрэльчанка.

Першы ўсесаюзны студэнцкі аўтапоезд «Дружба-70» зрабіў сваё падарожжа па маршруту Мінск—Магілеў — Горкі—Орша—Віцебск—Обаль — Наваполацк — возера Нарач — Гродна — Ваукавыск — Брэст—Белавежская пушча—Мінск. Сярод 200 удзельнікаў аўтапоезда было 25 савецкіх і замежных студэнтаў БДУ.

Кіламетры, якія праехалі разам юнакі і дзяўчаты з розных краін свету, можна смела назваць кіламетрамі дружбы. Аб багатых уражаннях ад гэтай паездкі гавораць запісы у блакнотах, у кнізе водгукаў аўтапоезда, у кнігах наведвальнікаў музеяў і памятных месц, аб іх расказваюць на вечарах дружбы.

Толькі ў Магілёўскай вобласці невялікімі групамі турысты пабывалі у сямі калгасах, на ўдарнай камсамольскай будоўлі «Лаўсанбуд», наведалі абласны краязнаўчы музей, у будынку якога у ліпені 1919 года працаваў член рэўваенсавета 16-й арміі Сяргo Арджанікідзе, накіраваны партыяй на заходні фронт для арганізацыі барацьбы з польскімі інтэрвентамі, наведалі месцы, звязаныя з рэвалюцыйнай дзейнасцю П. М. Лепяшынскага і С. М. Будзённага.

У г. Горкі студэнтаў вітаў рэктар старэйшай у краіне ардэнаноснай сельскагаспадарчай вышэйшай навучальнай установы БСГА акадэмік К. М. Сонцаў. Юнакі і дзяўчаты наведалі мемарыяльны комплекс і музей савецка-польскага таварыства ў пасёлку Леніна, дзе 12—13 кастрычніка 1943 года адбыўся сумесны бой савецкіх воінаў і Першай польскай дывізіі імя Касцюшкі супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Дэлегацыя польскіх студэнтаў — удзельнікаў аўтапоезда — пакінула такі запіс у кнізе наведвальнікаў музея: «Мы вельмі удзячны савецкаму народу за памяць і клопат аб свяшчэнных для польскага народа месцах, на якіх пачыналася гісторыя новай, сацыялістычнай Польшчы. Няхай жыве і мацнее дружба паміж польскім народам і народамі Савецкага Саюза!».

У Оршы турысты наведалі заслонаўскія месцы, пабывалі ля манумента «Кацюшы» на высокім беразе Дняпра, адкуль у 1941 годзе ўступіла у бой першая батарэя вядомых ракетных установак.

У Віцебску ўсе з цікавасцю знаёміліся з тым, што звязана з імёнамі Бацькі Міная — Міная Шмырова і Героя Савецкага Саюза Веры Харужай.

Савецкія і замежныя студэнты наведалі прамысловыя прадпрыемствы, піянерскія лагеры, зрабілі вячэрнюю прагулку на цеплаходах па Заходняй Дзвіне. Цікавасць выклікаў Рэспубліканскі музей камсамольскай славы у Обалі і маладыя камсамольскі горад Наваполацк, які вырас побач са старажытным Полацкам. Сваім хараством парадавала турыстаў возера Нарач. Тут яны правялі двое сутак. Начавалі у палатках, а днём наведалі партызанскія зямлянкі, пабывалі на крутым беразе возера, дзе узвышаецца велічны абеліск—сімвал вечнай памяці аб тых, хто змагаўся і аддаў сваё жыццё у гады Вялікай Айчыннай вайны.

Цёплымі, сардэчнымі былі сустрэчы на Гродзеншчыне. Тут удзельнікі аўтапоезда наведалі гісторыка-археалагічны музей, прамысловыя прадпрыемствы, піянерскія лагеры, далёка вядомы калгас «Прагрэс». Вось што сказаў выпускнік Маскоўскага універсітэта Хашыд Эль Шэйбамі з Ірака: «Поезд «Дружба» прайшоў па беларускай зямлі не адну тысячу кіламетраў. Усюды, дзе бывалі, нас цёпла і радасна сустракалі беларускія юнакі і дзяўчаты, сустракалі хлебам і соллю, як сустракаюць сапраўдных сяброў. Мы задаволены сустрэчай з працаўнікамі калгаса «Прагрэс». Тут мы ўбачылі паверхі новабудоўляў нат палямі — гэта здорава! Гэта і ёсць збліжэнне ўзроўняў горада і сяла».

Наведаўшы у г. Ваукавыску Ваенна-гістарычны музей вялікага рускага палкаводца Айчыннай вайны 1812 года П. І. Баграціёна, прадстаўнікі 47 краін свету накіраваліся ў Брэст. Тут госці пабывалі ля бессмяротнай крэпасці над Бугам, усклалі вянок з жывых кветак ля Вечнага Агню. Тут яны сустрэліся з удзельнікам абароны крэпасці Ц. П. Дамброўскім, агледзелі музей абароны цытадэлі. Менавіта на гэтай свяшчэннай зямлі нямецкі студэнт Зайдэль Бергольд, які вучыцца ў Маскве, сказаў: «...Мы наведалі месцы, дзе былі жорсткія баі з фашыстамі, дзе змагаліся і паміралі савецкія воіны і партызаны. І мы клалі кветкі да помніка і абеліскаў, схіляючы галовы перад мужнасцю тых, хто аддаў жыццё за наша агульнае светлае будучае. Нам прыемна, што савецкія людзі добра адрозніваюць сапраўдных немцаў ад фашыстаў і сённяшніх неанацыстаў і неафашыстаў».

Незабыўнае ўражанне зрабіла на гасцей і Белавежская пушча, і сталіца-прыгажуня Савецкай Беларусі. Турысты пабывалі у музеі гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, дзе сустрэліся з Героямі Савецкага Саюза, удзельнікамі партызанскага руху, былымі воінамі, пабывалі у Хатыні і ля Кургана Славы.

У кожным горадзе арганізоўваліся вечары дружбы. У Мінску замежных сяброў на вечары прымалі камвольшчыкі. Перад турыстамі тут выступіла капэла Рыгора Шырмы.

— Нам вельмі спадабалася Беларусь — край рэвалюцыйнай, баявой і працоўнай славы. Мы удзячны вам за знаёмства з гэтым цудоўным краем, з яго добрымі людзьмі, — так сказаў на фінішы ад імя сваіх сяброў в'етнамец Чан Кім Бінь.

Ул. ГАЛАЙША,
намеснік начальніка аўтапоезда «Дружба».

ДА ЎВАГІ ПЕРШАКУРСНІКАЎ

Прафурленне студэнцкага клуба БДУ імя У. І. Леніна ў сувязі з падрыхтоўкай да 50-годдзя нашага універсітэта аб'яўляе набор у наступныя калектывы мастацкай самадзейнасці:

народную харавую капэлу

народны аркестр народных інструментаў

народны ансамбль танца «Крыжачок»

студэнцкі тэатр

эстрадны ансамбль

духавы аркестр

вакальную і цымбальную групы.

Запіс у гэтыя калектывы мастацкай самадзейнасці праводзіцца ў прафкоме (галоўны корпус, пакой 205) штодзённа.

ПРАФУРЛЕННЕ КЛУБА.

● *беларускія лясныя ягады прыйшліся да спадобы в'етнамскім дзяўчатам.*

Рэдактар А. А. НІКОЛЕНКА.

АТ 09395 Адрас рэдакцыі: г. Мінск, Універсітэцкі гарадок, галоўны корпус, п. 106. Т-22-07-19. Друкарня выдавецтва ЦК КП Беларусі. Тыраж 2000 экз. Зак. 1089.